УДК 37.018

# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАФІЛАКТЫКА ДЭВІЯНТНЫХ ПАВОДЗІН ВУЧНЯЎ

**В. М. Наумчык**
*докт. пед. навук, прафесар*
*прафесар кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*г. Минск, Рэспубліка Беларусь*
*viktor_n@list.ru*
**М. А. Пазднікаў**
*к.п.н, дацэнт, дырэктар рэспубліканскай*
*гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Mikhail.pazdnikov@list.ru*
**Р. П. Наумчык**
*старшы выкладчык беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*viktor_n@list.ru*

**Анатацыя.** Мэтай працы з'яўляецца прадстаўленне методыкі, якая дазваляе скласці сацыяльны партрэт навучэнца. Такі партрэт дазваляе ажыццявіць маніторынг паспяховасці навучэнца і вызначыць так званыя "скокі" паспяховасці. Апошнія, як правіла, сведчаць аб сацыяльным дыскамфорце навучэнца, што з'яўляецца крыніцай яго дэвіянтных паводзін.

**Ключавыя словы:** сацыяльны дыскамфорт; дэвіянтныя паводзіны; маніторынг паспяховасці; эксперымент; выхаванне; выхаванец.

# SOCIAL AND PEDAGOGICAL PREVENTION OF DEVIANT BEHAVIOR OF STUDENTS

**V. Naumchyk**
*Doctor of Pedagogical Sciences, Professor*
*Professor of the Department of General and Child Psychology*
*Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University*
*Minsk, Republic of Belarus*
**M. Pozdnikov**
*PhD, Associate Professor, Director*
*of the I. V. Akhremchik Republican Gymnasium-College of Arts*
*Minsk, Republic of Belarus*
**R. Naumchik**
*Senior lecturer in Belarusian and Russian languages*
*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract.** The purpose of the work is to present a methodology that allows you to create a social portrait of a student. Such a portrait allows you to monitor a student's success and determine the so-called "spikes" of success. The latter, as a rule, indicate the student's social discomfort, which is the source of his deviant behavior.
**Keywords:** social discomfort; deviant behavior; success monitoring; experiment, education; student.

Спазнаць чалавека, спазнаць сябе і навакольных людзей – адвечная мара не толькі педагогаў. Аднак для выхавальнікаў яна значыць шмат больш: педагогам неабходна даступная сістэма вывучэння эфектыўнасці выхавання моладзі, якая дапаможа ім аператыўна выяўляць вынікі сваей працы, своечасова заўважыць тэндэнцыі і накіраванасць развіцця асобы маладых людзей, выявіць прабелы і недахопы ў выхаваўчай працы і аператыўна іх ухіліць.

Мы зыходзім з таго, што чалавек прынцыпова не можа быць спазнаны да канца. Любы чалавек у пэўнай ступені зачынены для навакольных. Гэта забяспечвае яму сацыяльны камфорт, вызваляе ад неабходнасці стала тлумачыць навакольным матывы сваіх паводзін, характар тых ці іншых думак і г. д.

У той жа час любы чалавек адкрыты для навакольных людзей найперш праз свае ўчынкі, дзеянні. Думкі яго таксама становяцца даступнымі шматлікім, паколькі дзейнасць чалавека ёсць адлюстраванне разумовага працэсу. Праз учынкі выяўляюцца міжасобасныя сімпатыі і антыпатыі, адносіны чалавека да самога сябе, да навакольных людзей, да нормаў паводзін у соцыуме, да ўкладу жыцця, да палітыкі, да працы. Такім чынам, праз паводзіны чалавека можна меркаваць аб яго ўнутраным свеце. Менавіта гэтую адкрытасць педагогі імкнуцца выкарыстоўваць для сацыяльнай дыягностыкі асобы. Спрабуючы стварыць колькасную мадэль асобы, варта заўсёды памятаць перасцярогу А. Эйнштэйна эксперыментатарам: «Вопыт ніколі не скажа тэорыі „так“, але кажа ў лепшым выпадку „можа быць“, большай жа часткай – проста „не“. Калі досвед узгадняецца з тэорыяй, для яе гэта азначае „можа быць“, калі ж супярэчыць ёй, аб'яўляецца прысуд – „не“» [1].

У выпадку праверкі эфектыўнасці выхавання эксперымент (адзінкавая рэакцыя) не можа сказаць "так", ен толькі паказвае на тэндэнцыю ў развіцці выхаванасці чалавека. Варта адзначыць, што чалавек паспяхова адаптуецца да любых умоў, у тым ліку і да ўздзеянняў выхаваўчага характару. Навучэнец (студэнт, салдат) вельмі хутка разумее, якую рэакцыю ад яго чакае педагог і, адказваючы рэакцыяй на стымул, дэманструе "сваю выхаванасць".

Вось чаму колькасная ацэнка эфектыўнасці выхавання па «супадзенні фактычнага выніку з ідэальным» адказвае толькі «быць можа». У адных умовах выхоўваны паводзіць сябе так, у іншых, – магчыма, інакш. Пры гэтым важна сачыць за тым, каб навучэнцам ажыццяўляўся свабодны выбар паводзін.

Для ажыццяўлення эфектыўнага выхавання мы прапануем выкарыстоўваць метад сацыяльнага маніторынгу навучэнца. Дадзены метад мы адносім да метадаў негвалтоўнага педагагічнага ўздзеяння, ен дае магчымасць зафіксаваць факт «скоку паспяховасці», што з'яўляецца праявай сацыяльнага дыскамфорту асобы вучня і амаль заўседы папярэднічае наступу сітуацыі, якую педагогі называюць цяжкавыхоўнасцю [2].

Для правядзення маніторынгу фарміруецца спіс параметраў, па якіх адсочваецца паспяховасць выхаванца. Такімі параметрамі могуць быць: паспяховасць па тым ці іншым прадмеце; стаўленне да вучобы ў цэлым; паводзіны ў навучальнай установе і па-за ёй; грамадская актыўнасць; стаўленне да педагагічных уздзеянняў; узровень развіцця карысных інтарэсаў, ведаў, навыкаў; знешняя культура паводзін; стаўленне да алкаголю; стаўленне да тытуню; стаўленне да наркотыкаў; культура гаворкі, засмечанасць яе нецэнзурнымі выразамі і інш.

Кожны з параметраў мае пяць узроўняў: найвялікшы, добры, сярэдні, нізкі і вельмі нізкі. Выніковую ацэнку прастаўляе класны кіраўнік ў канцы кожнай чвэрці. Сукупнасць адзнак дазваляе атрымаць інтэгральную карціну паспяховасці навучэнца ў выглядзе слупковай дыяграмы. Сукупнасць такіх дыяграм за навучальны год дае магчымасць прасачыць дынаміку паспяховасці вучня ў цэлым, а таксама па розных параметрах. Звяртаецца першым чынам увага на скокі паспяховасці па тым ці іншым паказчыкам. Задачай педагогаў з'яўляецца высветліць прычыну рэзкага зніжэння паспяховасці.




*Малюнак 1 – Карта вымярэння сацыяльнай паспяховасці навучэнца*

Для гэтага куратар групы або сацыяльны псіхолаг могуць правесці адпаведную гутарку з навучэнцам, наведаць урокі, звярнуўшы ўвагу на тыя дысцыпліны, па якіх паспяховасць рэзка знізілася, прааналізаваць узаемаадносіны навучэнца з аднагодкамі, з педагогамі, з навакольнымі людзьмі. Усе гэта дазваляе папярэдне выявіць прычыны такога стану, знізіць сацыяльны дыскамфорт навучэнца і ў значнай ступені папярэдзіць яго цяжкавыхоўнасць.

Дадзеная методыка дазваляе ажыццявіць ацэнку і маніторынг цэлых груп навучэнцаў. Для гэтага варта вылічыць сярэдняе значэнне ў групе па кожным параметры. Вядома, у дадзеным выпадку слупкі на дыяграме не будуць кратныя цэлым лікам.

Разам з тым трэба выразна разумець, што праблемы ў выхаванні з'явіліся не раптам. Яны спелі на працягу многіх гадоў, і адразу іх вырашыць практычна немагчыма. Але гэта зусім не гаворыць аб тым, што яны невырашальныя. Іх можна вырашыць, але толькі на шляху супрацоўніцтва з кожным навучэнцам, стварыўшы ўмовы, калі той сам захоча нешта змяніць у сваіх паводзінах, у ладзе жыцця. Педагагічная праца з моладдзю абавязкова павінна праводзіцца негвалтоўнымі метадамі, цярпліва, без імператыўных прыёмаў.

**Спіс літаратуры**

1. Утияма, Р. К чему пришла физика: от теории относительности к теории калибровочных полей. / Р. Утияма – М., 1982. – С.15.

2. Наумчик, В. Н. Воспитание «трудных» детей: Теория. Практика. Эксперимент: пособие для учителей, воспитателей, студентов, магистрантов, аспирантов пед. высш. учеб. заведений / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2013. – 472 с.